# ПА КОНКУРСУ І ЛЬГОТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

дысцыплінах. Тыя, хто набраў 9 балаў, ад наступных экзаменаў вызваляліся. Такіх аказалася 125 чалавек.

Пасля ўступных экзаменаў склаўся наступны прахадны бал: аддзяленне гісторыі — 17, біялагічны факультэт, аддзяленне рускай мовы і літаратуры, аддзяленне эканомікі працы — 16; аддзяленне механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, вытворчыя патокі матэматычнага і фізічнага факультэтаў — 15; аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры, педагагічны паток матфака — 14; геалагічны факультэт і педагагічны паток фізічнага факультэта — 13. Па некалькіх спецыяльнасцях больш 40 абітурыентаў было прынята з паўпрахадным балам.

Уладальнікі залатых медалёў маглі стаць студэнтамі пасля першага экзамена. Гэта ўдалося толькі 82 выпускнікам школ. На вялікі жаль, 6 медалістаў атрымалі на першым экзамене па фізіцы і матэматыцы нездавальняючыя адзнакі. Цяжка вызначыць і асноўную прычыну «правалу». Але, думаецца, што медалі гэтых абітурыентаў, вобразна кажучы, мелі «бляклы водбліск». Назавём школы, якія падрыхтавалі такіх медалістаў: буда-кашалёўская СШ № 2, Дуравіцкая СШ Буда-Кашалёўскага раёна, жлобінская СШ № 9, рэчыцкая СШ № 8, Вышамірская СШ Рэчыцкага раёна, Шклоўская СШ Магілёўскай вобласці.

Па рэкамендацыях педагагічных саветаў на педагагічныя спецыяльнасці павінны адбірацца найбольш падрыхтаваныя, актыўныя і здольныя да педагагічнай працы выпускнікі школ. Аднак і ў гэтай справе не абышлося без «агрэхаў». Асобныя аддзелы народнай асветы накіравалі на вучобу юнакоў і дзяўчат, у атэстатах якіх былі здавальняючыя адзнакі. Натуральна, такія накіраванні (у тым ліку Цэнтральнага і Чыгуначнага районаў нашага горада) былі адхілены.

Нам уяўляецца, што значнага паляпшэння яшчэ патрабуе работа сярод вучнёўскай моладзі па яе прафарыентацыі. Выбар будучай прафесіі — справа вельмі сур'ёзная. У ёй ні ў якім разе нельга памыляцца.

Увогуле ж, мяркуем, што сёлета, як і ў папярэднія гады, у наш універсітэт паступілі найбольш падрыхтаваныя і дастойныя набываць у ім вышэйшую адукацыю. Пажадаем жа ўсім першакурснікам настойліва авалодваць вяршынямі ведаў, быць актывістамі ў шматгранным студэнцкім жыцці, памнажаць лепшыя традыцыі нашага універсітэта.

**С. ГОЛІК,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі, дацэнт.**



**Фотаінфармацыя**

# ЯНЫ СТАЛІ СТУДЭНТАМІ





З 1432 абітурыентаў, якія сёлета паступалі у наш універсітэт, пераважную большасць складалі ўчарашнія выпускнікі сярэдніх школ. У вядучую вышэйшую навучальную ўстанову Палескага рэгіёна імкнуліся таксама юнакі і дзяўчаты, якія мелі пэўны стаж працоўнай дзейнасці, звоненыя ў запас з радоў Савецкай Арміі воіны, маладыя спецыялісты, якія закончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы.

Вучыцца ў ГДУ жадала моладзь з Гомеля і Гомельшчыны, іншых абласцей Беларусі, з-за яе межаў.

Змешчаныя на гэтай старонцы фотаздымкі былі зроблены ў час уступных экзаменаў. Алена Ліс іца (уверсе злева) з залатым медалём закончыла лельчыцкую СШ № 1 і вырашыла стаць філолагам. Першы экзамен па рускай мове і літаратуры яна здала на «выдатна» і ўжо тады прымала віншаванні з паступленнем у ГДУ.

Да паступлення ў наш універсітэт Алег Галавачэнка закончыў Любаньскую сярэднюю школу Акцябрскага раёна. Потым ён атрымаў добрую жыццёвую загартоўку, калі ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Афганістане праходзіў армейскую службу. Цяпер Алег будзе набываць спецыяльнасць гісторыка.

Людміла Осіпава, якую вы бачыце на ніжнім здымку, зафатаграфаваную ў час здачы экзамена па рускай мове і літаратуры, родам з Магілёўшчыны. Яе паступленню ва універсітэт папярэднічалі тры гады плённай працы на Беларускім шынным камбінаце.

Трое першакурснікаў, тры розныя біяграфіі... Разам з тым іх аб'ядноўвае адно — вялікае жаданне набыць высакародную прафесію педагога.

Фота У. Чысціка, М. Высоцкага.

СЛОВА — ПЕРШАКУРСНІКАМ

# УДЗЯЧНЫ НАСТАЎНІКАМ

**Аляксей Дарашкоў і Юрый Драянкоў — сябры. Жывуць у адным мікрараёне, разам вучыліся ў СШ № 44 г. Гомеля. У іх інтарэсах шмат агульнага. На працягу вучобы ў школе заўзята захапляліся радыётэхнікай, канструяваннем. І калі атрымалі атэстаты сталасці, доўгіх ваганняў, які выбраць далейшы шлях, у іх не было. Рашэнне сяброў было аднадушным — паступаць на фізічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. І вось Аляксей і Юра ўжо студэнты ГДУ. Імі яны сталі, як медалісты, пасля першага ж уступнага экзамена па фізіцы, які вытрымалі на «выдатна».**

Зазначым, што ў гомельскай СШ № 44, дзе **вучыліся юнакі, у сёлетнім,** юбілейным для яе выпуску, з залатымі медалямі закончылі школу 16 чалавек. Пры паступленні ў наш універсітэт, іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы яны прадэманстравалі трывалыя і глыбокія веды. Так, першакурснікамі матэматычнага факультэта ГДУ сталі таксама яе сёлетнія выпускнікі Алег Гіндэліс, Наташа Тарасенка і інш.

**Калі адбылася наша размова ў рэдакцыі газеты з А. Дарашковым і Ю. Драянковым, юнакі ў першую чаргу загаварылі аб сваіх настаўніках.**

**А. ДАРАШКОЎ:** Так, мы вельмі ім удзячны за веды, якія яны нам далі. У тым, што збылася наша мара, -мы сталі студэнтамі, іх вялікая заслуга. Як цяпер не ўспомніць добрымі словамі нашага класнага кіраўніка М. Я. Драбіцкую! Яна вучыла нас працаваць, настойліва і паўсядзённа, правільна планаваць час... Шмат карыснага далі нам урокі дырэктара школы заслужанага настаўніка БССР, дэлегата XXVI з'езда КПСС, поўнага кавалера ордэнаў Славы, Мікалая Афанасьевіча Лебедзева. Яго ўрокі былі для нас не толькі ўрокамі гісторыі, але і міру, жыцця. У нас дзейнічае музей баявой славы «Шукальнік», у рабоце якога мне давялося прымаць удзел. Разам з таварышамі збіралі цікавыя матэрыялы пра Героя Савецкага Саюза Мядзведзева, імя якога носіць піянерская дружына школы. Усе мы, хто актыўна займаўся ваенна-патрыятычнай работай, стараліся ўносіць свой пасільны ўклад у тое, каб наш музей насіў ганаровае званне народнага. Спадзяемся, што хутка яно будзе прысвоена музею.

**Ю. ДРАЯНКОЎ:** Так ужо атрымалася, што з усіх прадметаў, якія вывучаюць у школе, мне, як і Аляксею, больш за ўсё падабалася фізіка. Яна давала прастору для творчасці, фантазіі. Захапленне ёй падмацоўвалася жаданнем паспрабаваць зрабіць нешта самому. Калі ў школе, можа для гэтага было крыху і малавата ведаў (маю на ўвазе праграмны школьны курс фізікі), дык цяпер, калі паступіў ва універсітэт, думаю іх будзе дастаткова. Я, як і мой сябар, таксама хачу добрымі словамі ўспомніць нашага выкладчыка фізікі Уладзіміра Мікалаевіча Эстрына. Дзякуй яму!

**Упэўнена ідуць па шляху сваёй мары юнакі. Пажадаем жа ім поспехаў!**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

У верасні г.г. рэкамендуецца правесці палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**1. Новыя метады гаспадарання — у дзеянне.**

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці патрабаванні і задачы, змешчаныя ў Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб шырокім распаўсюджанні новых метадаў гаспадарання і ўзмацненні іх уздзеяння на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу» (гл. «Экономическую газету», № 32 за 1985 г.)

**2. Дарогай ведаў — у імя стварэння** (Да Дня ведаў 1 верасня).

Матэрыял публікуюць усе газеты. Гл. таксама артыкул на гэту тэму ў часопісе «Агитатор» № 16 за 1985 г.

### II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**3. Прымнажаць дасягнутае, наверстаць упушчанае** (Аб абавязку кожнага працаўніка горада і вёскі памножыць свае творчыя намаганні дзеля выканання планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў 1985 года і пяцігодкі ў цэлым).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

**4. Дакладнасць і сабранасць у рабоце — важны рэзерв павышэння прадукцыйнасці працы.**

Рэкамендуецца абмеркаваць у калектывах пытанні і праблемы, узнятыя ў артыкуле «Парадак і мы», апублікаваным у «Известиях» 22 жніўня г.г.

**5. Своечасова і без страт убраць бульбу** (Аб арганізацыі дакладнай, зладжанай работы спецыялізаваных атрадаў, уборачнай тэхнікі, транспартных сродкаў на бульбяных плантацыях).

Матэрыял публікуе «Сельская газета».

### III. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**6. Грамадства — для сям'і, сям'я — для грамадства** (У гутарцы на канкрэтных прыкладах раскрыць, якія клопаты праяўляе партыя і дзяржава аб умацаванні матэрыяльных і духоўных асноў сям'і, **як сям'я выконвае свае грамадзянскія абавязкі перад грамадствам**).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

**7. Алкагалізм — разбуральнік асобы** (Аб згубным уплыве алкаголю на фізічнае і маральнае здароўе чалавека, аб важнасці актыўнага ўдзелу ўсіх і кожнага ў барацьбе за перадоленне п'янства і алкагалізму).

Матэрыял публікуе газета «Звязда». Гл. таксама часопіс «Агитатор», № 15 1985 г.

### IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

**8. Прыклад сапраўднай міралюбнасці** (Мараторый СССР на любыя ядзерныя выбухі — новы важны крок на шляху да міру і сацыяльнага прагрэсу).

Гл. матэрыялы на гэту тэму ў штотыднёвіку «За рубежом», № 34 за 1985 г.

**9. Капіталізм без прыкрас: разбой пад маскай «дэмакратыі»** (Аб імкненні амерыканскага імперыялізму захаваць і распаўсюдзіць сваё панаванне ў Лацінскай Амерыцы).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Международная жизнь», № 7 за 1985 год.

